**М. М. Воінава-Страха**

# ПРАБЛЕМНА-ТЭМАТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ РЭАЛІСТЫЧНАЙ МАЛОЙ ПРОЗЫ У. СЦЯПАНА

Шматлікія выклікі, з якімі вымушана сутыкацца грамадства ў XXI стагоддзі, непазбежна ўплываюць на светаўспрыняцце сучаснага чалавека і асаблівасці яго псіхалагічнай рэакцыі на зменлівасць і непрадказальнасць акаляючых умоў. Дадзеная сітуацыя парадаксальная па сваёй сутнасці. Панаванне “культуры без межаў”, здавалася б, стварае неабмежаваныя магчымасці для ўсебаковай асобаснай самарэалізацыі, але разам з тым вымушае сутыкацца з неабходнасцю верыфікацыі разнародных, а падчас і некантраляваных інфармацыйных плыней.

Згаданыя акалічнасці спрыяюць непазбежнаму пераасэнсаванню ўсталяванай сістэмы каштоўнасцей. Вядома, агульначалавечыя аксіялагічныя складнікі з прычыны сваёй універсальнасці і абумоўленай назапашаным у іх досведам трываласцю павінны былі б скласці ўстойлівы падмурак у маральна-этычнай і духоўнай сістэме грамадства. Аднак новыя ідэйна-эстэтычныя павевы часам вылучаюцца настолькі непрадказальна-інтэнсіўным характарам, што працэс іх фільтравання істотна ўскладняецца не толькі прадстаўнікамі старэйшага, але і малодшага пакалення.

Беларускія мастакі слова надзвычай чуйна рэагуюць на любыя падобныя змены ў свеце, адлюстроўваючы ўсе, здавалася б, няўлоўныя імпульсы, тонкасці і дэталі на старонках сваіх твораў. Адным з такіх пісьменнікаў, у чыёй творчасці прадстаўлена шырокая палітра вобразаў сучаснікаў, з’яўляецца Уладзімір Сцяпан (нар. у 1958 г.). Вядомы як “майстар кароткага жанру”, аўтар вылучаецца адмысловай “выяўленчасцю” пісьма, “калі маляванне (як працэс і мэта адначасова) становіцца сюжэтным грунтам (“Мінскі альбом”) альбо аб’ектам мастацкай інтэрпрэтацыі” (І. Шаўлякова, 2013). Сярод адметнасцей яго індывідуальна-творчага стылю можна таксама вылучыць надзвычай чуйную ўвагу да дэталі і адметны псіхалагізм. Яго творчая спадчына ўключае зборнікі “Вежа” (1990), “Сам-насам” (1990), “Адна капейка” (2012), кнігі “Настаўнік. Сяргей Пятровіч Каткоў” (2013), “Папяровая шапка” (2018), “Хвалі” (2019).

Як вядома, адной з асаблівасцей сучаснага беларускага літаратурнага працэсу з’яўляецца пэўная трансфармацыя звыклай за доўгія дзесяцігоддзі савецкага мінулага выхаваўчай функцыі мастацкага слова, што прыводзіць да

відавочнага ўскладнення яе сэнсавага ядра. У сугучнасці з гэтай тэндэнцыяй У. Сцяпан на старонках сваіх твораў не прапаноўвае гатовыя "жыццекаштоўныя формулы", не задае дакладна вызначаную мадэль паводзін. Пісьменнік часцей выбірае ролю знешняга сузіральніка, які занатоўвае пярэстую гаму сучаснага жыцця, фіксуе розныя характары, падзеі, з'явы, займаючы пры гэтым безацэначную пазіцыю.

Па-філасофску стрымана У. Сцяпан факусуе ўвагу на асэнсаванні сутнасці зменлівага свету. Яго не пакідае жаданне спасцігнуць і прааналізаваць тыя фактары, што абумоўліваюць сучаснае аблічча маральна-этычнай сістэмы чалавечага быцця, яе знакавых паняційных складнікаў, якія ўплываюць на асаблівасці асобаснай самаідэнтыфікацыі.

Так, У. Сцяпан, прапанаваў сваё вызначэнне, якое даволі ёміста характарызуе дынамічна-супярэчлівы лад жыцця ў прасторы XXI стагоддзя, – "безназоўная рака". У навеле з аднайменнай назвай аўтар па-мастацку выразна перадае сітуацыю "экзістэнцыяльнага памежжа", у якой можа апынуцца кожны, хто знаходзіцца на скрыжаванні розных маральна-этычных, духоўных каштоўнасных сістэм.  Гэта своеасаблівая характарыстыка і сучаснай часавай плыні, і самога жыцця, і тонкай мяжы паміж жыццём і смерцю.

Нельга не згадзіцца з Ул. Сцяпанам, што *ў жыцці няма выпадковасцяў, усё звязана, знітавана, пераплецена, і, на першы погляд, падзеі, далёкія ў часе і па месцы дзеяння – пачатак і працяг адно другога... Ланцуг – імя якому – жыццё* (У. Сцяпан, 2012). Агульначалавечая аксіялагічная сістэма, якая ўключае і каштоўнасць жыцця як адну са сваіх дамінантаў, утрымлівае законы, якія забяспечваюць сутнасную аснову экзістэнцыі асобы. Яе парушэнне аўтаматычна прыводзіць да непазбежнай адказнасці: *...паабяцаў – зрабі. Не зрабіў – адказвай* (У. Сцяпан, 2012).

Любы негатыўны ўплыў на аднаго чалавека здольны спарадзіць ланцуговую рэакцыю, вынікам якой можа стаць адчуванне поўнай бездапаможнасці перад жыццём. *І тады разумееш, што застаўся сам на сам, а той, хто вёў, падказваў – адыйшоў, пакінуў цябе на дарозе, і невядома ці вернецца, згадае пра тваё існаванне і дасць паратунак...*

Працяг філасофскіх разважанняў У. Сцяпана адлюстраваны ў зборніку "Хвалі" (2019). Аўтар засяроджвае ўвагу на мастацкім асэнсаванні партрэта сучасніка, які не заўсёды здольны вытрываць пад націскам неспрыяльных жыццёвых абставін, вынікам чаго з'яўляецца пасіўна-бязвольная пазіцыя да ўласнага лёсавызначэння ("Сустрэча"), дэфармацыя традыцыйных чалавечых каштоўнасцей: вычварнае пераасэнсаванне паняцця "шчасце" ("Шчасце"), здрада ў адказ на выратаванне жыцця ("Маладая бульба"), гатоўнасць ахвяраваць чужым жыццём як рэакцыя на крыўду ("Таіці").

Прыведзеныя прыклады, здавалася б, сведчаць пра тое, што вялікая трыяда прыгажосць – дабрыня – ісціна і сапраўды перасталі быць кіраўніцтвам да дзеяння (Х. Артэга-і-Гасэта) для прадстаўніка сучаснага грамадства. Аднак шэраг навел са зборніка "Адна капейка" (2012) дэманструюць іншы ракурс мастацкага асэнсавання сучаснай аксіялагічнай сістэмы. Пісьменнік звяртаецца да духоўнасці як асновы сямейна-родавых адносін. Для У. Сцяпана менавіта сям'я ўтварае трывалы падмурак экзістэнцыі любой асобы. Таму цалкам невыпадкова, што аўтар звяртаецца да канцэпту дом, бацькоўская хата, якія ў мастацкай прасторы аўтара надзелены сакральным характарам і сімвалізуюць непахісны падмурак, што забяспечвае трываласць роду. Важна акрэсліць, што менавіта ў бацькоўскім доме сканцэнтраваны не толькі памяць і дух продкаў, але працяг яго роду. З гэтай прычыны для героя цалкам непрымальная думка аб любой патэнцыяльнай пагрозе для роднай хаты: *Калі ён уяўляў сабе дом разрабаваным, з выбітымі вокнамі, з разламанай падлогай, загаджаны, закіданы смеццем – яму рабілася млосна* (У. Сцяпан).

Часам бацькоўская хата выступае ў ролі і апошняга прытулку. Так, у навеле "На вуліцы школьнай" Віцька Кныш завяршае свой жыццёвы шлях менавіта ў родным доме. Неабходна адзначыць, што ў агульнай светапогляднай мастацкай сістэме У. Сцяпана дадзены факт не сведчыць пра фатальнасць і безвыходнасць асобаснай экзістэнцыі. Менавіта ва ўстойлівасці сямейна-радавога дрэва, непарушнай повязі і патэнцыяльным працягу яго складнікаў пісьменніку бачыцца магчымасць захавання і агульначалавечага аксіялагічнага ўніверсуму. Моцным падмуркам у акрэсленым працэсе з'яўляецца раскрыццё духоўнасці як асновы сямейна-родавых адносін, адлюстраванне пераемнасці адмысловага генетычнага кода, а таксама спасціжэнне ўніверсальных законаў быцця.

Неад'емнай асновай асобаснай карціны свету, згодна з У. Сцяпанам, з'яўляецца менавіта захаванне агульначалавечага маральна-этычнага кодэксу. Адхіленне ад яго, сістэмнае парушэнне спрадвечна існуючых законаў быцця безапеляцыйна фатальнае для любога прадстаўніка грамадства, безадносна да яго статусу і высокіх дасягненняў ("Па той бок ночы"). Пры гэтым У. Сцяпан на палярызуе свет на "адмоўнае"і "станоўчае". Ён пакідае права за чытачом на ўласную інтэрпрэтацыю і ацэнку падзей і ўчынкаў.

Вышэйакрэсленае дазваляе адзначыць устойлівасць як неад'емную ўласцівасць аксіялагічнай мадэлі мастацкага свету У. Сцяпана, якую забяспечваюць такія дамінанты, як духоўнасць, трываласць сямейна-родавай повязі, захаванне агульначалавечых маральна-этычных каштоўнасцей. У малой прозе У. Сцяпан засяроджваецца на філасофскім асэнсаванні разнаскіраваных каардынат быцця свайго сучасніка ў хутказменлівай прасторы XXI стагоддзя.